Гродзенская гарадская цэнтралізаваная
бібліятэчная сістэма;
Аддзел бібліятэчнага маркетынгу
ГЦБ імя А. Макаёнка

# "Суровая праўда і крылатая фантазія"




Метадычныя парады да 130-годдзя
з дня нараджэння Янкі Маўра

2013

***Суровая праўда і крылатая фантазія: метадычныя парады да 130-годдзя з дня нараджэння Янкі Маўра / Гродзенская гарадская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма; аддзел бібліятэчнага маркетынгу ГЦБ імя А.Макаёнка / уклад. Баброва Н.Ю. – Гродна, 2013. – 20 с.***

*Выданне прысвечана 130-годдзю з дня нараджэння агульнапрызнанага "бацькі" беларускай дзіцячай літаратуры Янкі Маўра, і ўтрымлівае сцэнарныя і бібліяграфічныя матэрыялы.*

*Будзе карысна бібліятэкарам, настаўнікам, чытачам.*

*"Я належу да таго пакалення людзей,*
*чыё дзяцінства кнігі Янка Маўра поўнілі шчаслівым*
*жыватворчым захапленнем ад нечаканых адкрыццяў*
*і пазнання незнаёмага дзівоснага свету..."*

*Алена Васілевіч*



Першаадкрывальнікам у асваенні новага для беларускай літаратуры прыгодніцкага жанру стаў Янка Маўр. Ён павёў чытачоў у займальнае падарожжа па свеце і назаўсёды застаўся ўладаром дзіцячых сэрцаў.

Нарадзіўся Янка Маўр (Іван Федараў) 10 мая 1883 года у латвійскім горадзе Лібава (цяпер горад Ліепая). Бацька — сталяр, рана памёр, і разам з маці малы Янка пераехаў на яе радзіму у беларускую вёску Лебянішкі Ковенскай губерні (цяпер Літва).

У 1875 годзе ён скончыў пачатковую школу, затым рамесную навучальню ў Коўне. Паступіў у Панявежскую настаўніцкую семінарыю, адкуль у канцы 1902 года за вальнадумства, «за сумненні ў рэлігіі» яго адлічылі з апошняга, выпускнога, класа. Аднак пасведчанне настаўніка пачатковай школы ён усё ж атрымаў, здаўшы экстэрнам экзамены за семінарскі курс. Працаваць пачынаў школе пад Панявежам (Новае Месца), затым быў пераведзены ў вёску Бытча на Барысаўшчыне.

У 1906 годзе ўдзельнічаў у нелегальным з'ездзе рэвалюцыйна настроеных настаўнікаў у в. Мікалаеўшчына. Разам з Якубам Коласам і іншымі актыўнымі ўдзельнікамі быў аддадзены пад суд, пазбаўлены права выкладаць у школе і ўзяты пад нагляд паліцыі.

У 1911 годзе ўладкаваўся выкладчыкам геаграфіі і гісторыі ў Менскую прыватную гандлёвую школу. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі працаваў у школе, у Рэспубліканскім саюзе работнікаў асветы, у Наркамаце асветы БССР.

Настаўніцкую працу Янка Маўр пакінуў толькі ў 1930 годзе, калі перайшоў у дзяржаўнае выдавецтва Беларусі, дзе працаваў да 1936 года. У душы ён усё роўна заставаўся настаўнікам.

Літаратурнай справай Я.Маўр заняўся, маючы за плячыма звыш 20

гадоў педагагічнай практыкі ў школах Беларусі. «Чалавек ідзе» - першая кніга Я. Маўра, з якой пачаўся яго літаратурны шлах.

Цікавая гісторыя своеасаблівага псеўданіма «Маўр». Напісаўшы сваю першую аповесць і вырашыўшы яе надрукаваць, настаўнік /Іван Фёдараў стаў думаць пра псеўданім і капацца ў сваёй памяці. Перабраў назвы дрэў, раслін, ды нічога падобнага не знайшоў. Выбраць яркі, запамянальны псеўданім ніяк не ўдавалася. І раптам, калі ён ўжо страціў надзею падабраць псеўданім, яму прагадалася ходкая шылераўская фраза: «Маўр зрабіў сваю справу, маўр можа ісці». Слова «маўр» у яго вымаўленні загучала ярка, прыгожа, мнагазначна. Пісьменнік дадаў да прозвішча чыста беларускі варыянт свайго імя – атрымаўся псеўданім !Янка маўр». Менавіта пад гэтым псеўданімам назашжды ўвайшоў пісьменнік у беларускую літаратуру.

У 1927 годзе ў часопісе "Піянер" была надрукавана аповесць "Чалавек ідзе". Адна за адной выходзяць аповесці так званага майн-рыдаўскага цыкла: «У краіне райскай птушкі» (1926), «Сын вады» (1927), дзе аўтар выступае як абаронца правоў каланіяльных і залежных народаў, як паўнамоцны прадстаўнік шматпакутных абарыгенаў Паўночна-Заходняй Афрыкі і наогул усіх прыгнечаных «каляровых» туземцаў. Таксама ў 1927 годзе выходзяць апавяданні «Слёзы Тубі», «Незвычайная прынада», «Лацароні». У 1929 годзе — раман «Амок».

У 30-я гады Маўр, нібы насыціўшыся «экзатычным», іншаземным матэрыялам, звяртаецца да роднай жыццёвай рэальнасці, у якой дзейнічаюць юныя героі. Гэта аповесць «Палескія рабінзоны», якая з’явілася ў 1930 годзе і прыгодніцкая аповесць «ТВТ», якая ўбачыла свет у 1934 годзе і атрымала першую прэмію на Усебеларускім конкурсе дзіцячай кнігі. Гэтай кнігай зацікавіўся М. Горкі. Па яго просьбе Маўр тэрмінова пераклаў аповесць на рускую мову і выслаў яму. С. Маршак у сваім дакладзе «Аб вялікай літаратуры для маленькіх», гаворачы аб дасягненнях літаратуры, сярод іншых адзначыў і «значную школьную аповесць, напісаную ў Беларусі». У 1934 годзе Я. Маўр стаў членам Саюза савецкіх пісьменнікаў Беларусі.

Задачу больш глыбокага спасціжэння дзіцячай душы, своеасаблівасці дзіцячага ўспрымання аўтар ажыццявіў у гэты час у творах «малой» прозы: у 1937 годзе з’явілася апавяданне «Шчасце», у 1939 — «Бярозавы конь», у 1940 — «Начальнік артылерыі».

У чэрвені 1941 года Янка Маўр эвакуіраваўся, спачатку ў Новасібірск, затым у Алма-Ату. У 1943 годзе пісьменнік пераязджае ў Маскву і да заканчэння вайны працуе ў Маскве рэдактарам дзіцячай літаратуры Дзяржаўнага выдавецтва БССР. Вяртаецца ў родны Мінск пасля вызвалення яго ад фашысцкіх захопнікаў.

На працягу 1946 — 1948 гг. ён разам з П. Рунцом займаецца зборам і рэдагаваннем дзіцячых успамінаў пра вайну для кнігі «Ніколі не забудзем», якая выйшла ў 1948 годзе з прадмовай Я. Коласа і атрымала высокую ацэнку грамадскасці не толькі ў Беларусі, але і шырока за яе межамі.

У 1946 годзе выходзяць з друку апавяданні «Завошта» і «Максімка». У 1948 годзе выйшла першая кніга аўтабіяграфічнай трылогіі “Шлях з цемры”. У 1950 годзе — апавяданне «Запіска».

Пасляваенны перыяд у творчай біяграфіі пісьменніка адзначаны стварэннем новых жанравых формаў — навукова-фантастычнай і аўтабіяграфічнай аповесцей.

«Фантамабіль прафесара Цылякоўскага» убачыў свет у 1954 годзе. Гэта можна лічыць трэцім творам аўтара ў жанры навуковай фантастыкі: подступамі да яго з'явіліся фантастычная казка «Вандраванне па зорках» (1927) з цыкла «Піянерскія казкі», а затым — «Аповесць будучых дзён» (1932) напісана ў жанры сацыяльнай утопіі.

Пісьменнік быў узнагароджаны двумя ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнам “Знак Пашаны”. У 1968 годзе яму было нададзена ганаровае званне заслужанага дзеяча культуры БССР.

Памёр Янка Маўр 3 жніўня 1971 года на 89-м годзе жыцця. Пахаваны ў Мінску. На магіле пісьменніка пастаўлены арыгінальны помнік (скульптар І. Міська): над цёмнай мармуровай плітой нібы трапеча белы ветразь... Гэтую дэталь успрымаеш як увасабленне рамантычнай захопленасці Я. Маўра жыццём, як сімвал таго, што гэты таленавіты пісьменнік сваёй творчасцю вынес беларускую дзіцячую літаратуру далека наперад, актыўна садзейнічаў яе паскоранаму развіццю.

У 1972 годзе, ужо пасмяротна, адзначаны Дзяржаўнай літаратурнай прэміяй БССР.

Яго імем названы вуліца, бібліятэка ў Мінску, Бытчанская школа на Барысаўшчыне. Па рашэнню ЮНЕСКА ў 1983 годзе стогадовы юбілей Янкі Маўра святкаваўся ва ўсім свеце. У 1993 годзе, у сувязі са 110-годдзем з дня нараджэння, у Рэспубліцы Беларусь установлена літаратурная прэмія імя Янкі Маўра, якая штогод прысуджаецца беларускім пісьменнікам за лепшыя творы для дзяцей і юнацтва.

Неардынарнасць асобы гэтага таленавітага мастака выявілася і ў яго загадкава-прывабным псеўданіме, у якім так суладна загучалі блізкае нам душэўна-светлае беларускае імя Янка і далёкае, экзатычнае, заморскае слова Маўр. У сайім гэтым псеўданіме нібы запраграмавана адметнасць светаадчування пісьменніка: сыноўняя адданасць Беларусі і трывога за ўсё чалавецтва.

## Прыклады назваў кніжных выстаў:

- «Ён пісаў добрыя кнігі»;
- «Капітан нашых падарожжай - Янка Маўр»;
- «Чалавек з крылатай фантазіяй»;
- «Трапяткі ветразь яго творчасці!..»;
- «Капітан нашых падарожжаў»;
- «Добры і мудры настаўнік»;
- «Мысліцель і летуценнік».

## Аб жыцці і творчасці пісьменніка

*Бібліяграфічны спіс літаратуры*


1. **Маўр Янка** // Беларус. энцыкл. : у 18 т. – Мінск, 2000. - Т.10. - С. 218.
2. **Маўр Янка** // Беларускія пісьменнікі: біблігр. слоўн. : у 6 т. / [пад рэд. А.В. Мальдзіса]. – Мінск, 1994. – Т. 4. – С. 256-262.
3. **Янка Маўр** // Беларускія пісьменнікі (1917-1990) : даведнік / [склад. А.К. Гардзіцкі]. – Мінск, 1994. – С. 374-375.
4. **Бесова, М.А.** День белорусскіх робинзонов в лагере // Пазашкольнае выхаванне. – 2009. - №7. – С. 15-21.
5. **Воюш, І.Дз.** Маўр-Дзя-Дун і Дэздэмона: вывучэнне творчасці Янкі Маўра з выкарыстаннем магчымасцей сеціва / Інга Воюш // Роднае слова. – 2013. - №5. – С. 59-61.
6. **Гурэвіч, Э. С.** Янка Маўр : нарыс жыцця і творчасці / Э. С. Гурэвіч ; рэдактар П. К. Дзюбайла ; [прадмова З. У. Драздовай]. — 2-е выд., дап. — Мінск, 2004. — 150 с.
7. **Ефимова, М.** Таким он был: [120 лет со дня рождения Янки Мавра] / М. Ефимова // Неман. — 2003. — № 5. — С. 161-168.
8. **Зубкоўскі Б.** Другое чаканне Маўра / Браніслаў Зубкоўскі // Беларуская думка. – 2005. - № 5. – С. 172-177.
9. **Зубкоўскі, Б.А.** Янка Маўр: мастацкі матывацыйны вопыт першапраходцы / Бранислаў Зубкоўски // Роднае слова. – 2012. - №5. – С. 17-21.
10. **Кузьміч, Н.** Усе мы дзеці прыроды: [апавяданне “Багіра” Янкі Маўра] / Н. Кузьміч // Роднае слова. — 2008. — № 5. — С. 5-6.
11. **Мицкевич, М. М.** Внучка Коласа и Мавра поэтессой не стала: [интервью с внучкой классиков белорусской литературы Марией Михайловной Мицкевич] / М. М. Мицкевич; беседовала О. Кисляк // СБ. Беларусь сегодня. - 8 декабря. — С. 5.
12. **Міцкевіч, Н.** Доўгая дарога: (ад дома Янкі Маўра да дома Якуба

Коласа) / Н. Міцкевіч // Полымя. — 2012. — № 4. — С. 167-176. — (Заканчэнне. Пачатак у № 3, 4, 5, 7, 8, 2011 г., № 1, 2012 г.).

13. **Рунец, П.** Чалавек з крылатай фантазіяй / Пятро Рунец. — Мінск, 1983. — 64 с.
14. **Садоўская, Л.** Капітан нашых падарожжаў Янка Маўр / Л. Садоўская // Бібліятэка српануе. – 2003. - №2. – С. 11-13.
15. **Струк, Т.** Вывучэнне аповесці "У краіне райскай птушкі" Янкі Маўра // Роднае слова. – 2010. - №3. – С. 76-78.
16. **Янка Маўр** (Іван Міхайлавіч Фёдараў) (1883-1971) : [творчы шлях : характарыстыка твораў] // Беларуская дзіцячая літаратура : вучэбны дапаможнік / пад рэдакцыяй А. М. Макарэвіча. — Мінск, 2008. — С. 197-220.
17. **Янка Маўр** // Гісторыя беларускай літаратуры XX ст. (20-50-я г.). — Мінск, 2000. — С.455-477.
18. **Яўхімава, М.** Добры і мудры настаўнік: творчасць Янкі Маўра: [да 110-годдзя з дня нараджэння] / М. Яўхімава // Роднае слова. — 1993. — № 5. — С. 7-15.
19. **Яфімава, М.** "Дзіцячым пісьменнікам трэба нарадзіцца…": [да 125-годдзя з дня нараджэння Янкі Маўра] / М. Яфімава // Полымя. — 2008. — № 5. — С. 160-164.
20. **Яфімава, М.** Ён пісаў добрыя кнігі // бібліятэка прапануе. – 2009. - №4. – С. 22-24.
21. **Яфімава, М.** Шляхамі роднай Беларусі: [аповесць "Палескія рабінзоны" Янкі Маўра] / М. Яфімава // Роднае слова. — 2008. — № 9. — С. 30-32.
22. **10 мая** – 125 год з дня нараджэння Янкі Маўра (1883-1971), пісьменніка // Новыя кнігі. - 2008. - №1. – Дадатак. – С. 12-14.
23. http://yankamavr.ru – сайт Янкі Маўра.
24. http://knihi.com/Janka_Maur/ - старонка пісьменніка на сайце «Беларускаая палічка. Беларуская электронная бібліятэка».
25. http://fantlab.ru/autor6880- старонка на сайце «Лабараторыя фантастыкі».

# Крыжаванка «Падарожжа з Янкам Маўрам»



**Па гарызанталі:**

**1.** Даўняя назва г. Ліепая (Латвія), дзе 130 гадоў таму ў сям'і сталяра Міхаіла Фёдарава нарадзіўся будучы піс-меннік, пачынальнік беларускай дзіцячай літаратуры Янка Маўр (Іван Фёдараў). **4.** Званне малодшага камандзіра на караблі. **6.** Планета сонечнай сістэмы, куды адпраўляюцца ў падарожжа Святлана і Светазар - героі фантастычнай аповесці Янкі Маўра «Фантама-біль прафесара Цылякоўскага». **7.** Марское двухмачтавае паруснае судна ХУШ-ХІХ стагоддзяў. **9.** Краіна ў паўднёва-ўсходняй Азіі, дзе адбываюцца падзеі прыгодніцкага рама-на «Амок». **11.** Апавяданне Янкі Маўра, першапачатко-вая назва якога была «Шчасце». **13.** Лаўка ў сялянскай хаце. **15.** Верхняя частка дрэва. **16.** Краіна ў Азіі, дзе разгортваюцца падзеі ў апавяданні Янкі Маўра «Незвычайная прынада». **17.** Буйная азіяцкая краіна, месца дзеяння змагароў за свабоду герояў апавядання «У цясніне». **18.** Прадстаўнік індзейскай народнасці Мексікі. **20.** Слуп для парусоў на судне. **21.** Вогненная .... Востраў на поўдні Лацінскай Амерыкі (Чылі), на якім адбываюцца захапляльныя падзеі з Мангам, галоўным героем аповесці Янкі Маўра «Сын вады». **26.** Высакародная пра-фесія, якой амаль усё жыццё аддаў рамантык Янка Маўр. **28.** Буйная жывёліна, забойства якой кантрабандыстамі глыбока закранула Мірона і Віктара, герояў аповесці «Палескія рабінзоны». **29.** Вялікая і лёгкая спартыўная парусная лодка. **30.** Драўляная бочачка, якая ўваходзіць у рыштунак шлюпкі і служыць для захавання запасаў прэснай вады. **31.**

Востраў у Індыйскім акіяне, згаданы пісьменнікам у аповесці «Слёзы Тубі». **32.** Прыгожая заходнееўрапейская краіна, дзе адбываюцца падзеі з удзелам галоўнага героя Джузепе ў апавяданні «Лацароне».

**Па вертыкалі:**

**2.** Бакавая сценка марскога або рачнога судна, самалёта. **3,** Асоба, упаўнаважаная для выканання даручэнняў. **4.** Невялічкае аднамачтавае судна. **5.** ... Твэн. Амерыканскі пісьменнік - сабрат Янкі Маўра па дзіцячай літаратуры. **6.** Самуіл .... Расійскі дзіцячы паэт, продкі якога па лініі бацькі былі ўраджэнцамі Койданава; ён вельмі добра ставіўся да творчасці Янкі Маўра. **8.** Новая .... Буйны востраў, які па плошчы займае другое месца на Зямлі пасля Грэнландыі; на ім адбываюцца захапляльныя падзеі, апісаныя Янкам Маўрам у аповесці «У краіне райскай птушкі». **10.** Адмаўленне. **12.** Цесныя зносіны, дзелавая сувязь. **14.** Дазвол на што-небудзь, зацверджаны вышэйшай ін станцыяй. **17.** Кухня на судне. **19.** Чарнільная пляма. **22.** Свяшчэнная кніга мусульманаў. **23.** Канат для прычала суднаў. **24.** Моцная амеры канская або англійская гарэлка. **25.** Замінка ў руху каня. **27.** Пакаты спуск.

**Адказы на крыжаванку:**

Па гарызанталі**:** 1. Лібава**.** 4. Боцман. 6. Марс. 7. Брыг. 9. Інданэзія. 11. “Шапка”. 13. Услон. 15. Крона. 16. Індыя. 17. Кітай. 18. Ацтэк. 20. Мачта. 21. Зямля. 26. Настаўнік. 28. Зубр. 29. Яхта. 30. Анкерок. 31. Цэйлон. 32. Італія.

Па вертыкалі: 2. Борт. 3. Агенет. 4. Боцік. 5. Марк. 6. Маршак. Гвінея. 10. Не. 12. Кантакт. 14 Санкцы\я. 17. Каран. 23. Канец. 24. Віскі. 26. Збой. 27. Схіл.

## Віктарына

## “Што ты ведаеш пра жыццё і творчасць Я.Маўра”

1. Назавіце сапраўднае імя Янкі Маўра (Іван Міхайлавіч Фёдараў).
2. Кім працаваў Я.Маўр да таго, як пачаў займацца літаратурай? (настаўнікам).
3. Якія прадметы ён выкладаў? 9 гісторыю, геаграфію).
4. Якую назву насіла першая аповесць, напісаная Маўрам? (“Чалавек ідзе”).
5. Ці лічыце вы, што ёсць што-небудзь агульнае паміж кнігамі Я. Маўра “ТВТ” і А. Гайдара “Цімур і яго каманда”?
6. Хто такія “светлячкі”? (Светазар і яго сястра з аповесці “Фантамабіль прафесара Цылякоўскага”).
7. Чые гэтыя рэчы: шнурок з чаравіка, лук, карэньчыкі? Што і для чаго змайстравалі з іх героі адной аповесці? ( Віктра і Мірон, для здабычы агню, “Палескія рабінзоны”).
8. Чаму Маўра называюць беларускім Ж. Вернам?

## Літаратурная гульня “Успомні назвы”

Успомніце назвы:

- Аўтабіяграфічнай аповесці пісьменніка (“Шлях з цемры”)
- Першага беларускага рамана для дзяцей (“Амок”)
- Твора, у якім Маўр пераконваў чытача, што наёцікавейшае – гэта не заўсёды далёкае, што часта мы не бачым па-сапраўднаму цікавага таго, што знаходзіцца побач. Што гэта за аповесць? (“Палескія рабінзоны”).
- Краіны, дзе жыве райская птушка (Новая Гвінея).
- Страшнай хваробы яванцаў (“Амок”).
- Дрэва, якое квітнее толькі раз за ўсё жыццё на 50-м годзе. (Яванская пальма).
- Аповесці, на старонках якой мы сустракаемапісанне стражатных жывёл – вялізных мастадонтаў, тапіраў і іншых (“Чалавек ідзе”).
- Таварыства, створанага школьнікамі ў аповесці “ТВТ” (Таварыства ваяўнічых тэхнікаў).
- Аповесці, у якой мы сустаркаем такое радыёпаведамленне: “Трэці дзень у нас пурга. Гідролаг кузьменка пры смерці. Выратаваць можа толькі ўліванне крыві. Група першая. Яе ў нас няма…” (“Фантамабіль прафесараЦылякоўскага”).
- Выправіце спіс твораў Янкі маўра: “У кріне вады”, “Фагнтамыбіль Тубі”, “Сын прафесрара”, “Чалавек райскай птушкі”, “Слёзы Цылякоўскага”, “Ямок з цемры”, “Шлях ідзе”.

## **“Ён пісаў добрыя кнігі для дзяцей”**

### Бібліяграфічны агляд твораў Я. Маўра

*Кніга для дзяцей павінна быць толькі добрай кнігай –*
*цікавай і карыснай.*
*Яна мае ў жыцці дзіцяці выключнае значэнне.*
*Я і сам, мусіць, стаў пісьменнікам толькі дзякуючы кнігам.*
*Яны мне адкрылі свет і людзей, яны абудзілі тое,*
*што пасля назвалі фантазіяй.*
*Янка Маўр*



Сёння цяжка паверыць, але прызнаная, любімая юнымі чытачамі творчасць Янкі Маўра калісь выклікала спрэчкі крытыкаў і нават непрыманне. Сцвярджалі, што творы пісьменніка шкодныя. Такія закіды гучалі ажно да 1972 г. , калі Я.Маўр стаў лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі БССР (на жаль, пасмяротна). А праз 11 гадоў рашэнем ЮНЕСКА юбілей празаіка адзначаўся ва ўсім свеце.

Каб стаць дзіцячым пісьменнікам, трэба ім, як сцвярджаў В. бялінскі, нарадзіцца, быць асобай няўрымслівай, шчодрай, узвышагай. Янка Майр быў менавіта такім.

Поспех аповесці ***«Чалавек ідзе»*** ў многім прадвызначаны тым, што аўтар яе, настаўнік Іван Фёдараў, быў чалавекам універсальнай эрудыцыі, валодаў прыроджаным адчуваннем дзіцячай душы, меў больш як дваццацігадовы стаж працы ў школе. Таму верыў у та-ленавітасць дзяцей, у тое, што яны здольныя ўсё зразумець, ва ўсім разабрацца, на ўсё адгукнуцца душою, трэба толькі ўскалыхнуць іх эмоцыі, актывізаваць іх фантазію. Дзецям павінна быць цікава. Гэта ўлічваў Янка Маўр у сваёй педагагічнай і пісьменніцкай дзейнасці.




Складаная тэма паходжання чалавека раскрываецца ў аповесці «Чалавек ідзе» ў запамінальных малюнках-эпізодах, адзначаных дынамізмам. З цікавасцю сочаць чытачы за нялёгкай барацьбой перша-бытных людзей са стыхіяй, за тым, як яны вырыва-юцца з «царства звяроў». На тварах іх, як узнагарода, засвяціўся тады першы смех. «Гэта засмяяўся Чалавек-Пераможца!» - такімі словамі заканчваецца апо-весць. Яна поўніцца прадчуваннем новых казачных адкрыццяў, якімі - у гэтым не сумняваўся аўтар - адзначыць свой гістарычны шлях Яалаве.

Так у 1926 годзе з аповесцю «Чалавек ідзе» прыйшоў у беларускую дзіцячую літаратуру адзін з яе заснавальнікаў, любімы пісьменнік многіх пакаленняў дзяцей Беларусі і не толькі Беларусі - Янка Маўр. Вядома,

што кнігі гэтага аўтара перакладзены на дзесяткі моў свету: рускую, украінскую, узбекскую, грузінскую, эстонскую, латышскую, літоўскую, таджыкскую і іншыя мовы народаў былога Савецкага Саюза, а таксама на балгарскую, польскую, славенскую, кітайскую, румынскую, нямецкую, французскую і іншыя.

Янка Маўр спрыяў павышэнню аўтарытэту, папулярызацыі беларускай дзіцячай літаратуры, умацаванню яе ўзаемасувязей з іншымі літаратурамі. Пераклаў на беларускую мову творы рускіх класікаў - А. Чэхава, М. Прышвіна, Д. Маміна-Сібірака, а таксама замежных - М. Рыда, Ф. Купера, Р. Кіплінга, Ж. Верна, М. Твэна, Х.К. Андэрсана.

Адданы сын Беларусі Янка Маўр не мог застацца абыякавым да лёсу іншых народаў. Яму заўсёды хаце-лася як мага болып ведаць не толькі пра родную Беларусь, але і пра ўсю нашу планету і яе насельнікаў.

Невыпадкова яшчэ ў 1903 годзе, да таго як стаць пісьменнікам, І. Фёдараў зацікавіўся і дасканала авалодаў папулярнай у той час штучнай міжнароднай мовай эсперанта. Гэта дало яму магчымасць наладзіць перапіску з эсперантыстамі многіх краін свету. На імя настаўніка Фёдарава прыходзілі пісьмы з Англіі, Францыі, Новай Зеландыі, Інданэзіі, Амерыкі, Румы-ніі, Галандыі, Італіі, Явы, Новай Гвінеі і інш.

Захапленне эсперанта працягвалася і пасля Вялікай Айчыннай вайны, фактычна да канца жыцця Янкі Маўра. Аднак асабліва ажыўленай яго перапіска з эсперантыстамі была ў дарэвалюцыйны час і ў 20-30 гады мінулага стагоддзя. Эсперантысты (у асноўным настаўнікі) прысылалі Янку Маўру кнігі, часопісы, рэдкія і вельмі цікавыя матэрыялы на мове эсперанта. І сам Іван Міхайлавіч выпісваў перыёдыку на гэтай мове.

Названыя матэрыялы, а таксама навуковая, энцыклапедычная літаратура з асабістай бібліятэкі (да Вялікай Айчыннай вайны Янка Маўр меў адну з самых багатых у Мінску хатніх бібліятэк) пашыралі кру-гагляд, веды пісьменніка, што вельмі патрэбна было яму і ў настаўніцкай, і ў літаратурнай дзейнасці.

Несумненна, перапіска з эсперантыстамі, прыведзеныя лявалі цікавасць Янкі Маўра да тэмы жыцця ў іншых краінах. У 20-я гады ён напісаў цыкл твораў, прысвечаных у асноўным жыццю народаў каланіяльных і залежных краін. Гэта аповесці «У краіне райскай птушкі» (1928), «Сын вады» (1928), раман «Амок» (1929), апавяданні «Слёзы Тубі», «Лацароні», «Незвычайная прынада» і інш. Усе яны ўвайшлі ў залаты фонд беларускай дзіцячай літаратуры, назаўсёды замацавалі за Янкам Маўрам славу выдатнага майстра прыгодніцкага жанру. «Янка Маўр, - пісала паэтэса Е. Лось, - паланіў сэрцы юных чытачоў сваімі пры-годніцкімі творамі, і мы з любоўю называем яго беларускім Жулем Вернам».

У творах пра далёкія краіны Янка Маўр выказаў спачуванне прыгнечаным народам, глыбока адчуў іх крыўды і боль.

Дзеянне першай прыгодніцкай аповесці з прыгожай назвай ***«У краіне райскай птушкі»*** адбываецца на востраве Новая Гвінея. Пачатак гэтага твора сваім гучаннем нагадвае зачын народнай казкі: «Далёка-далёка ад нас, на другім баку зямлі... на поўнач ад Аўстраліі ляжыць вялікі востраў Новая Гвінея...» Гэты тон жывой зацікаўленай размовы дапамагае юным чытачам нібы трапіць на той дзіўны востраў, дзе стаіць вечнае лета, дзе круглы год растуць і цвітуць расліны і кветкі, дзе знайшла прытулак казачнай прыгажосці райская птушка. Здавалася б, і жыццё на Новай Гвінеі павінна быць райскім...




Але ў той час там гаспадарылі англійскія каланізатары. Іх жорсткасць, сквапнасць, бесчалавечнасць удала падкрэсліваюцца ўключэннем успамінаў пра вядомага рускага падарожніка і даследчыка, які тры гады пражыў на Новай Гвінеі сярод папуасаў і стаў для іх дарагім гос-цем, сябрам. Нават імя яго засталося ў мове папуасаў для азначэння добрага чалавека, толькі вымаўляюць яны імя Маклая своеасабліва - «Макрай».

У аповесці «У краіне райскай птушкі» супрацьстаіць каланізатарам і вобраз місіянера Саку, дваццаціга-довага папуаса, стрыманага, высакароднага, які вало-дае пачуццём уласнай годнасці. Гэты вобраз міжволі выклікае сімпатыю, пра гэта пісала ў сваім пісьме Янку Маўру вучаніца 8-га класа Таня Князева. «А па-пуасы ўсе маглі б быць такім, як Саку», - зазначыла яна. Правільна зразумела дзяўчынка вельмі важную, увасобленую ў падтэксце думку аўтара: не папуасы вінаватыя ў сваёй страшнай адсталасці. Гэта свядомая палітыка каланізатараў, для якіх самае галоўнае - нажыва.

У аповесці «У краіне райскай птушкі» разам з выкрыццём каланіялізму выразна гучыць праблема маральнай перавагі так званых «дзікуноў» над тымі, што лічылі сябе прадстаўнікамі вышэйшай расы.

Гэтая праблема асноўная ў аповесці Янкі Маўра «***Сын вады»,*** якой споўнілася 85 гадоў. Як прыгадваў сам пісьменнік, твор гэты быў створаны нібы на адным дыханні. Аповесць «Сын вады» вызначаецца асабліва высокім ўзлётам фантазіі і мастацкага мыслення аўтара.

Галоўны герой аповесці «Сын вады» дзевятнаццацігадовы юнак - дзіця прыроды - Манг па душэўных, маральных якасцях значна вышэйшы за англійскую арыстакратку міс Грэт. Рызыкуючы сваім жыццём, ён выратаваў яе ў час страшэннай буры на моры, абе-рагаў, даглядаў. А яна? Спачатку баялася, што гэты «дзікун» яе з'есць, а потым

пачала адносіцца да Манга як да звычайнага слугі, якіх шмат было ў яе бацькі ў Лондане.

Міс Грэт не здолела аддзячыць свайму вырата-вальніку. Неўзабаве ён аказаўся ў чужым яму Лондане сярод тысяч беспрацоўных...

«Шкада Манга, - пісала ў сваім водгуку на апо-весць «Сын вады» Галя Сіўко, - хочацца, каб ён вярнуўся на Вогненную Зямлю». У сваіх пісьмах і да Вялікай Айчыннай вайны, і ў пасляваенны час юныя чытачы пыталіся ў Янкі Маўра, ці вярнуўся Манг у родныя мясціны...

Шырокі рэзананс далёка за межамі Беларусі меў раман Янкі Маўра ***«Амок»,*** у аснову якога пакладзены сапраўдныя падзеі - паўстанне, што адбылося на востраве Ява ў 1926 годзе. Ва ўступным слове да першага выдання рамана «Амок» Янка Маўр звярнуў увагу на тое, што асноўныя факты і матэрыялы, на якіх пабудавана гэтая кніга, былі атрыманы ім не-пасрэдна з Явы і Галандыі ад эсперантыстаў. Апрача таго, пісьменнік выкарыстаў артыкулы розных газет і часопісаў (у тым ліку замежныя).

Неўзабаве пасля выхаду твор гэты быў перакладзены на іншыя мовы, у тым ліку і на англійскую. Аўтар атрымаў шмат водгукаў. У іх выказваліся словы павагі, удзячнасці аўтару рамана «Амок». Былі там і асобныя ўдакладненні дэталяў звычаяў яванцаў. У наступных выданнях Янка Маўр улічыў тыя заўвагі.

Зазначым, што на Яве, ды і ва ўсёй Інданэзіі, раман «Амок» у пашане. І тут варта прыгадаць сустрэчу, якая асвятлялася ў прэсе і якую сам Іван Міхайлавіч успамінаў з задавальненнем. Адбылася тая сустрэча ў 1960 годзе, тады падчас сваёй паездкі ў Маскву су-працоўнік Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Інданэзіі Кхо КуатлІят спецыяльна наведаў Мінск, каб сустрэцца з беларускім пісьменнікам - аўтарам рамана «Амок». Сустрэча адбылася на кватэры Маўра. Госць з Інданэзіі быў вельмі ўражаны, калі даведаўся, што Янка Маўр ніколі не быў на Яве... А ён жа, карэнны інданэзіец, быў упэўнены, што аўтар рамана «Амок» жыў на Яве і нават быў удзельнікам паўстання 1926 года.




У цыкле твораў пра далёкія краіны не абышоў увагай Янка Маўр тэму дзяцінства, ёй прысвечаны апавяданні ***«Лацароні»,*** ***«Незвычайная прынада»***, а таксама жамчужына нашай беларускай дзіцячай літаратуры - апавяданне ***«Слёзы Тубі»***. Першымі слязінамі спагады, дабрыні і сёння западаюць яны ў сэрцы дзяцей.

Янка Маўр, вельмі патрабавальны, тонкі мастак слова, не прымаў голай дыдактыкі, маралі ў лоб.

Ён нічога не тлумачыў, не падказваў,

не навязваў дзецям. Верыў, што яны самі вычытаюць у падтэксце патрэбнае, самі ва ўсім разбяруцца, бо пазіцыя аўтара акрэслена выказана мовай вобразаў.

Творы Янкі Маўра не ўкладваліся ў ідэалагічныя схемы, не было ў іх адкрытага рэвалюцыйнага пафасу. З-за гэтага давялося пачуць нямала папрокаў таленавітаму пісьменніку-наватару ў 20-я, асабліва ў 30-я гады. Яго абвінавачвалі ў сацыяльнай прытупленасці, апалітычнасці, у захапленні замежнай экзотыкай, геаграфізмам, у «ідэалізацыі драбнюткіх дэталей старых часоў». Я. Маўр быў тонкім псіхолагам і таму не мог дазволіць сабе штучна да свайго твора прышрубаваць распаўсюджаны ў той час штамп: абавязковае рэвалюцыйнае пасталенне дзейнага персанажа. Не баяўся ён у дзіцячай кнізе трагічнага: гінуць многія героі рамана «Амок», трагічная смерць напаткала слаўнага, спрытнага Тубі з апавядання «Слёзы Тубі», драматычна склаўся лёс хлопчыка Сідры (апавяданне «Незвычайная прынада»).

Зараз нібыта няма каланізатараў і час не той, але не губляе значэння праблема чалавечнасці, праблема шчасця дзяцей. Гучыць яна і сёння надзённа ў апавяданнях Янкі Маўра «Слёзы Тубі», «Незвычайная прынада», «Лацароні».

Чалавек у любых умовах павінен заставацца чала-векам, павінен думаць пра людзей, быць уважлівым да іх лёсу. Задумацца над гэтым, пераканацца ў гэтым і сёння дапамагае апавяданне Янкі Маўра «Звяры на караблі» (1927) - цяперашняя назва «Бунт звяроў».

Сваё майстэрства ў галіне прыгодніцкага жанру Я. Маўр пацвердзіў аповесцю «***Палескія рабінзоны»,*** у якой арыгінальна, па-мастацку вынаходліва ўвасоблены сусветна вядомы матыў рабінзанады, што бярэ свой пачатак з вядомай кнігі Даніэля Дэфо «Рабінзон Круза». Выкарыстоўваючы навуковыя звесткі аб прыродзе нашага роднага беларускага Палесся, Я. Маўр лёгка пераконвае чытачоў у тым, што ў Беларусі ёсць шмат куткоў, не горшых за заморскія. Аповесць «Палескія рабінзоны» выхоўвае ў чытачоў патрыятычныя пачуцці, абуджае іх праз пазнанне. Героі гэтага твора Віктар і Мірон падабаюцца смеласцю, кемлівасцю, узаемнай падтрымкай, гумарам, які да-памагае ім пераадольваць цяжкасці.




Гумар - важная асаблівасць таленту Янкі Маўра, у гэтым пераконвае і яго аповесць з загадкавай назвай «ТВТ» («Таварыства ваяўнічых тэхнікаў»). Напісаны гэты твор у новым для беларускай дзіцячай літаратуры жанры школьнай аповесці.

Ва ўсіх сваіх творах пісьменнік выявіў псіхалагічна вельмі тонкае адчуванне асаблівасцей узросту дзяцей, што пацвярджаюць і яго вядомыя апавяданні «Бярозавы конь», «Начальнік артылерыі», «Падарожжа вакол дома», «Шчасце». Агульная танальнасць гэтых твораў - маторная, змест іх прасякнуты паэзіяй дзіцячых гульняў, адкрыццяў, шчасця.

Зусім іншыя перажыванні прынесла дзецям вайна. Страшэннай пачварай уварвалася яна ў іх лёсы (апавяданні «***Завошта?», «Дом пры дарозе», «Запіска», «Максімка***» і інш.). Сэрцам дакрануўся Янка Маўр да таго, што давялося перажыць дзецям у час акупацыі Беларусі, калі ён быў прызначаны галоўным рэдактарам кнігі «***Ніколі не забудзем***». Іван Міхайлавіч сустракаўся з многімі дзецьмі, удзельнікамі і сведкамі Вялікай Айчыннай вайны. Працы над гэтай кнігай аддаў шмат душы. Першае яе выданне выйшла ў 1948 годзе. Потым яна неаднаразова перавыдавалася. Кніга «Ніколі не забудзем» выдадзена на розных мовах свету. «Мы рабілі гэтую кнігу, - казаў Іван Міхайлавіч, -не па загаду начальства, а па загаду свайго сэрца, ад любві да дзяцей, да нашых слаўных юных герояў, да чытачоў».




Усё, што напісаў Янка Маўр, рабіў ён ад усяе душы, таму творы гэтага аўтара - чарадзейны свет мудрасці, дабрыні, чалавечнасці, дзе чытачоў заўсёды чакае сустрэча з жыццярадасным аўтарам-субяседнікам.

Нават агульная танальнасць і тых яго твораў, дзе ёсць трагічнае, - жыццясцвярджальная, бо ўвасоблена ў іх вера аўтара ў неперажожную сілу дабра, справядлівасць. Ён быў вялікім жыццялюбам, аптымістам. Жывая творчая думка, крылатая няспынная фантазія пабуджалі Янку Маўра да пошуку новага.

Смелым эксперыментатарам, які спрабуе зазірнуць у будучыню, не стрымлівае ўзлёту сваёй невычэрпнай фантазіі, паўстае перад чытачамі Янка Маўр у байцы «Пекла», у «Аповесці будучых дзён», у аповесці «Фантамабіль прафесара Цылякоўскага». Ён аўтар шматлікіх апавяданняў, таленавітых псіхалагічных навел, героі якіх - дзеці розных узростаў («Падарожжа вакол дома», «Шчасце», «Бярозавы конь», «Максімка» і інш.). У пасляваенны час ён актыўна, востра, баявіта выказаўся ў жанры палітычнага фельетона-памфлета. Вось назвы некаторых з іх: «Беласнежка ляціць за мора», «Сальвадорцы», «Некалькі слоў пра мараль» і іншыя. Галоўнае ў іх змесце - выкрыццё вар'яцкіх планаў падпальшчыкаў новай вайны, агрэсіўная сутнасць палітыкі некаторых

дзяржаў, найперш Амерыкі. Шмат якія радкі гэтых фельетонаў так і просяцца на старонкі сённяшняга друку.

Узбагаціла беларускую дзіцячую літаратуру аўтабіяграфічная трылогія Я. Маўра «Шлях з цемры», над працягам чацвёртай часткі яе пісьменнік працаваў да апошніх дзён свайго жыцця, і ўсё ж, на жаль, твор за-стаўся незакончаным.

У творах увасоблены ідэі Дабра, Чалавечнасці, таму чытачоў гэты мастак-наватар, жыццялюб знай-шоў у розных краінах. «І чытачоў знайшоў мільёны», - так пісаў у сваім пасвячэнні Янку Маўру паэт Станіслаў Шушкевіч. Не выпадкова ў 1983 годзе стагоддзе Маўра адпаведна з рашэннем ЮНЕСКА адзначалася ва ўсім свеце.

М. Яфімава, кандыдат філалагічных навук

## Клуб вясёлых і знаходлівых
## “Падарожжа у краіну Янкі Маўра”
### *Сцэнарый*

Дзеці дзеляцца на 4 каманды. Узначальваюць іх капітаны — найбольш дасведчаныя і падрыхтаваныя вучні, якія дапамагаюць сваім камандам рыхтавацца да гульні. Кожнай камандзе прапануецца адна аповесць Янкі Маўра: “Чалавек ідзе”, “Сын вады, “У краіне райскай птушкі”, “Палескія рабінзоны”. Капітаны атрымліваюць папярэднюю інфармацыю аб характары заданняў і кіруюць падарожжам сваіх каманд па старонках твора.



КВЗ праводзіцца ў форме спаборніцтва паміж камандамі. Заданні падзелены на 10 раздзелаў-конкурсаў. Бібліятэкар знаёміць дзяцей з парадкам правядзення гульні і сістэмай ацэнак адказаў (за кожнае заданне прадугледжана пэўная колькасць балаў).

*Конкурс “Рэкламны”.*

Трэба парэкамендаваць кнігу сваім сябрам так, каб ім захацелася яе прачытаць.

*Конкурс “Пазнай героя па апісанні”*

Зачытваюцца ўрыўкі з аповесці, але твор не называецца. Каманда пазнае, каму прысвечана характарыстыка.

<u>Па аповесці «Палескія рабінзоны»:.</u>

1. *«Худы, цыбаты дзяцюк з блакітнымі вачыма, доўгім птушыным носам і доўгімі светлымі валасамі. Разважлівы, спакойны.» (Мірон.)*
2. *«Прысадзісты, карчасты хлопец, чарнявы, з круглым пляскатым тварам. Жвавы, імклівы.» (Віктар)*
3. *«Высокі, дужы, гадоў пад пяцьдзесят чалавек з чорнай стрыжанай барадой і густымі чорнымі вусамі, якія апускаліся ўніз, як у маржа. Пад густымі бровамі глыбока сядзелі вузкія вочкі, якія надавалі яму люты выгляд.» (Бандыт — хутаранін Станоўскі.)*

<u>Па аповесці «Чалавек ідзе»:</u>

1. *«Галава доўгая, выцягнутая спераду назад, а зверху нібы прыплюснутая. Ілба, бадай, зусім няма, а які ёсць, дык не разбярэш, дзе ён пачынаецца. Нос таксама пляскаты, пераноссе ледзь прыкмегнае. Вочы сядзяць надта глыбока, а косць над імі выступае наперад, як страха.» (Чалавек.)*
2. *«У цемры замільгалі постаці нейкіх жывёл, трохі падобных да сабак, але больш прыткіх, з тоўстай шыяй, са спадзістай спінай. Уздоўж усёй спіны тырчала нібыта грыва, а папярод бакоў відаць былі рудыя палосы.» (Пены.)*
3. *«Жывёлы гэтыя, хоць і падобны былі да нашых сланоў, але ростам пераўзыходзілі іх прынамсі ў два разы. Даўжыня іх цела дасягала 8—10 метраў. Галава была даўжэйшай, як у сланоў, а хобат значна карацейшы. Галоўнай жа адзнакай былі біўні.» (Мастадонты.)*

<u>Па аповесці «У краіне райскай птушкі»:</u>

1. *Чаму Чунг-лі вымушаны быў уцякаць? (Сутычка з містэрам Брукам.)*
2. *«На другі раз усіх узварушыў крык боцмана Старка: — Глядзіце, глядзіце: на левым беразе чалавек на кані! Каб у нас закрычалі: «Глядзіце, слон на самалёце!», то здзівілі б людзей менш, чым тут словы «чалавек на кані». Чаму? (Коней там зусім не было.)*

*3. Хто такі Міклуха Маклай? Што ў папуасаў азначае слова «макрай»? (Добры чалавек.)*

*4. Чаму звычайна містэр Скот не лавіў уцекачоў з плантацыі? (Уцекачы, парушыўшы ўмову, нічога не атрымлівалі.)*

*5. Чаму папуасы не прынялі ідэй хрысціянства? (Лічылі, што бог Саку дапамагае толькі белым.)*

Па аповесці «Сын вады»:

*1. Аб чым марыў Манг? (Мець кану, каб плысці куды хочаш.)*

*2. Ці збылася мара Манга і ці прынесла гэта хлопцу шчасце? (Манг паплыў, куды даўно хацеў: у краіну белых людзей, але быў там нешчаслівы.)*

*3. Як здабываў Манг агонь? (Стукаў каменем аб камень.)*

*4. «Рэч была такая рэдкая, такая прыгожая і цікавая ў іх жыцці, што задарма губляць яе было шкада.» Якую рэч баяўся згубіць Манг? (Дзяўчыну.)*

*5. «Аднойчы Мгу з дачкой Тандо «збіралі» плады з дрэва.» Што гэта былі за плады? (Чарапашкі, малюскі, ракі, мядузы.)*

*Конкурс "Юныя натуралісты"*

Удзельнікі кожнай каманды знаёмяць з флорай і фаўнай, пра якія гаворыцца ў аповесці.

*Конкурс перакладчыкаў*

З дапамогай беларуска-рускага слоўніка перакласці на рускую мову невялічкія ўрыўкі з аповесцей. (Па адным чалавеку ад каманды.)

*Конкурс "Хто хутчэй?"*

Пакуль перакладчыкі працуюць, іх таварышы адказваюць на пытанні.

*Конкурс "Юныя географы"*

Камандзе «Палескія рабінзоны» — паказаць на карце свету Беларусь, а на карце Беларусі знайсці Палессе. «Чалавек ідзе»: паказаць на карце свету Еўропу сучасную і растлумачыць, якія змены адбыліся з першабытных часоў, як тады выглядала Еўропа. «У краіне райскай птушкі»: знайсці на карце свету Новую Гвінею. «Сын вады»: знайсці і паказаць Вогненную зямлю і Магеланаў праліў.

*Конкурс капітанаў*

Выправіць памылкі ў тэксце.

<u>Палескія рабінзоны</u>: «Хлопцы вельмі добра ведалі прыроду, лес, вёску. Яны шмат падарожнічалі». (Далей як за 10 км ад горада ім ніколі не даводзілася быць.)

«Вучыліся абодва добра, чыталі шмат кніжак, асабліва прыгодніцкіх. Паступова выявілася, што Мірон цікавіўся больш заалогіяй, Віктар — батанікай.№ (Наадварот, Мірон захапляўся батанікай, а Віктар — заалогіяй.)

<u>Чалавек ідзе</u> : «Лес парадзеў, і нашы падарожнікі выйшлі на палянку ля крыніцы. Тут зрабілі прывал. Тут толькі заўважылі, што з іх гуртка трох ужо не хапае…» (Не заўважылі, бо не ўмелі лічыць.)

«Адны селі адпачываць, другія пайшлі «пасвіцца», трэція падышлі да крыніцы напіцца. Там яны лажышся на жывот і, апусціўшы галаву, пілі проста з крыніцы. Наогул яны не баяліся вады і з вялікім задавальненнем лезлі ў раку ці возера». (Вельмі баяліся вады.)

<u>У краіне райскай птушкі</u>: «Трэба адзначыць, што сярод рабочых станцыі, або факторыі, было многа тутэйшых папуасаў». (Толькі дзесятак, астатнія кітайцы, японцы, малайцы.)

«На двары негр-кухар, або кок, як усюды на моры завуць кухараў, зварыў ужо вялізны казан чорнага варыва з бобу. Боб і рыс, багата прыпраўленыя мясам, былі любімай стравай рабочых». (Мяса ніколі не бачылі.)

<u>Сын вады</u>: «Манг забіў Нгару за тое, што той забраў яго кану». (Нгару забіў асьміног.)

«Забраўшы човен Нгары, Манг паехаў шукаць краіну белых людзей». (Белую птушку.)

*Лінгвістычны конкурс*

Дзеці тлумачаць лексічныя значэнні слоў.

<u>Палескія рабінзоны</u>: Даецца слова «**душагубка**» ў сказе: «З'есці мы збіраліся гэтую душагубку, ці што? Слова **ляцяга**: Жывага нязграбна поркалася ў вілаваціне бярозы. Віктар прыгледзеўся: «Гэта ляцяга…» Слова **дзьмухаць**: Мірон пачаў дзьмухаць. Словы **млын, гута**: Бацька Мірона працаваў у млыне, а Віктара - на шкляной гуце.

Чалавек ідзе: Тлумачацца словы **малпа, істота, вільгаць, трус, выцялі** ў наступных сказах: 1. Тым часам выходзіць, што перад намі не малпы, а нешта накшталт людзей. І сапраўды: гэта былі першыя істоты, якім больш-менш можна было даць назву чалавек. 2. Холад і вільгаць зноў абхапілі людзей, але пакуль што яны іх не адчуваюць. 3. І пачалі тады хлопцы ганяцца за трусам. 4. Важак і Краг ухапілі два сукі… і выцялі па спінах таго-другога з няпрошаных гасцей.

У краіне райскай птушкі: Словы **гумавы, копра, аздоблены, чарапашкі, белы** ў сказах: 1. Урэшце яны абодва апынуліся на гумавай плантацыі ў Новай Гвінеі. 2. Пасля гумы галоўнае месца займала копра. 3. На руках і нагах былі бранзалеты, па-майстэрску аздобленыя чарапашкамі. 4. Вось наш брат Саку. Ён уцёк ад нас і доўга жыў з белымі.

Сын вады: Словы **кану, волат, дзікун, кандор, нагавіцы** ў сказах: 1. Але гэта — і не вельмі далёка — плыве такая самая кану нейкага фуіджынца. 2. Ля волата-карабля бездапаможна гойдалася муха-лодка. 3. За ўсё свае жыццё яна нікога так не чакала, нікога так не жадала бачыць, як цяпер гэтага дзікуна-»людаеда». 4. Кандор цяпер ужо думаў не толькі аб самім сабе. 5. Адзін вясёлы паніч праз хвіліну прынёс яму нагавіцы.

*Конкурс мастакоў*

Да урока каманды падрыхтавалі ілюстрацыі да сваіх твораў. Мастацкі конкурс прадугледжвае іх абмеркаванне і калектыўную ацэнку.

*Конкурс кокаў*

Кожная каманда мае свайго кока, які павінен скласці меню, карыстаючыся стравамі, якія ўжываюць героі аповесці.

Кожны адказ ацэньваецца, вынікі заносяцца ў табліцу. У канцы гульні бібліятэкар падагульняе іх і называе каманду, якая найбольш паспяхова справілася з праграмай падарожжа. Каменціруюцца адказы другіх каманд, выстаўляюцца адзнакі.

Укладальнік Баброва Н.Ю.
Адказны за выпуск Камарова М.А.

# ЗМЕСТ

Прыклады назваў кніжных выстаў ....................................................4

Аб жыцці і творчасці пісьменніка: *бібліяграфічны спіс ліатаратуры* ......4

Крыжаванка «Падарожжа з Янкам Маўрам» .............................................6

Віктарына “Што ты ведаеш пра жыццё і творчасць Я.Маўра” ..................7

Літаратурная гульня “Успомні назвы” ........................................................8

“Ён пісаў добрыя кнігі для дзяцей” : *бібліяграфічны агляд твораў Я. Маўра* ..........................................................................................................8

Клуб вясёлых і знаходлівых “Падарожжа у краіну Янкі Маўра” .............15